УДК 808.26-3(07.07)

# Этнакультуралагічны кампанент пры выкладанні беларускай мовы ў тэхнічнай ВНУ

Гіруцкая Л.А., Сахончык А.П.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Нягледзячы на працэс сусветнай глабалізацыі, інтэрнацыяналізацыі адукацыі, актывізуецца гуманітарнае мысленне, назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя ўзмацнення ролі і значэння этнанацыянальнага фактару як у сусветным развіцці, так і ў жыцці асобных краін. У РБ надзвычай востра стаіць праблема пераадолення дэфармацый нацыянальнай свядомасці, адарванасці маладога пакалення ад нацыянальных традыцый. З пункту погляду этнапедагогікі мэтай выкладання беларускай мовы ў тэхнічнай ВНУ з'яўляецца не толькі фарміраванне ў студэнтаў лінгвістычнай кампетэнцыі, але і выхаванне нацыянальна свядомай асобы.

Этнакультуралагічная аспектызацыя вучэбнага матэрыялу дазваляе фарміраваць у студэнтаў навыкі пошуку, аналізу, асэнсавання нацыянальна маркіраваных моўных адзінак на розных узроўнях мовы і маўлення – ад фанетыкі да сінтаксісу і стылістыкі.

Так, апошнім часам навукоўцамі надаецца вялікая ўвага фанетыцы як непаўторнаму «гукаваму выгляду» мовы, які закладзены генетычна, бо абумоўлены рэзанансам мовы на ўзроўні гукаў з нацыянальнай прыродай. Менавіта такі падыход дазваляе студэнтам на аснове аналізу падрыхтаванага выкладчыкам моўнага матэрыялу і ўласнага маўлення самастойна не толькі вылучыць найбольш яркія фанетычныя рысы беларускай мовы, але і прыйсці да высновы аб прычынах адсутнасці напружанасці органаў маўленчага апарату як прыроднай аснове беларускага маўлення.

На ўзроўні лексікі ўвага павінна быць скіравана на нацыянальна-фонавую спецыфіку асабовага імені, адбор антрапонімаў, найбольш актуальных у свядомасці бедарусаў; на гісторыю слоў; на экзатызмы і безэквівалентную ў рускамоўным дачыненні беларускую лексіку; на сімвалічныя значэнні агульнавядомых паняццяў і праблемы інтэрферэнцыі.